**В.У. Рагачова,** *дацэнт*

# ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНАЙ КУЛЬТУРЫ БУДУЧЫХ САЦЫЯЛЬНЫХ ПЕДАГОГАЎ У ПРАЦЭСЕ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ

У сучасных умовах развіцця грамадства на ўсіх узроўнях усведамляецца неабходнасць перабудовы сістэмы вышэйшай адукацыі, якая павінна быць накіравана на павышэнне якасці падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў – мабільных, здольных да канкурэнцыі, адказнай і эфектыўнай дзейнасці ў прафесійнай, навуковай, інавацыйнай і кіраўніцкай сферах. Ажыццяўленне прынятага кірунку аднаўлення сістэмы адукацыі немагчыма без істотных змен у агульнай падрыхтоўцы выпускніка ВНУ. Гэтыя змены ў значнай ступені звязаны з павышэннем у адукацыйным працэсе ролі самастойнай вучэбнай і даследчай работы студэнтаў. Сёння самастойная работа ўключае розныя віды індывідуальнай і калектыўнай працы як на аўдыторных, так і пазааўдыторных занятках і можа быць вызначана як мэтанакіраваная, матываваная, структурыраваная самім студэнтам і карэкцыруемая ім дзейнасць [1, с.11–12].

Прафесійная дзейнасць работніка сацыяльнай сферы звязана непасрэдна з людзьмі, што дазваляе лічыць вызначальным фактарам поспеху гэтай дзейнасці педагагічную культуру спецыяліста сацыяльнай сферы [2, с. 248]. Сістэмны падыход да аналізу сацыяльна-педагагічнай культуры дае магчымасць вылучыць наступныя найбольш значныя яе кампаненты:

– тэарэтычную падрыхтоўку і практычны сацыяльна-педагагічны вопыт;

– педагагічнае майстэрства;

– прафесійна важныя якасці (педагагічная накіраванасць, маральныя, камунікатыўныя, перцэпцыйныя, эмацыянальныя якасці).

Набыццё адзначаных якасцей можа быць дасягнута толькі ў працэсе актыўнай самастойнай дзейнасці асобы, таму што менавіта гэтая форма навучання забяспечвае найбольш поўны ўлік індывідуальных асаблівасцей студэнта, стымуляванне яго



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пазнавальных інтарэсаў, разумовай актыўнасці і самастойнасці, фарміраванне навыкаў навукова-даследчай і практычнай прафесійнай дзейнасці, развівае патрэбнасць у творчым падыходзе да вырашэння праблем.

Адной з асаблівасцей самастойнай работы як педагагічнай катэгорыі з'яўляецца тое, што рэалізацыя мэт і зместу самастойнай вучэбна-даследчай дзейнасці спрыяе ажыццяўленню як адукацыйнай функцыі, так і функцыі асобаснага развіцця, самакіравання і самакантролю. Згодна з такім падыходам да трактоўкі сутнасці самастойнай работы ў педагагічных навуках выдзяляюць наступныя тры ўзроўні самастойнай дзейнасці [3, с. 43].

1. *Рэпрадуктыўны.* На гэтым узроўні прапануюцца заданні згодна з прыкладам: выкананне заданняў з дапамогай вядомага спосабу, запаўненне табліц (пры наяўнасці даных), стварэнне схем ці планаў і інш.

У рамках курса "Сацыяльная педагогіка" мы прапаноўваем наступныя заданні. Па-першае, гэта ўзаематэставанне студэнтаў, якія разбіваюцца на пары і павінны скласці адзін для аднаго невялікі тэст (не больш за 5 пытанняў) па праблемах, якія разглядаліся на лекцыі. Потым адбываецца ўзаемаправерка. Па-другое, гэта складанне канспекта па тэме, якая не асвятлялася на лекцыі, на аснове рэкамендаванай літаратуры (напрыклад, па тэме "Развіццё сацыяльнай педагогікі ў Беларусі"). Па-трэцяе, распрацоўка слоўніка ці персаналій па тэме. Таксама эфектыўным заданнем з'яўляецца распрацоўка студэнтамі табліц, якія адлюстроўваюць, напрыклад, працэс станаўлення і развіцця сацыяльнай педагогікі ў нашай краіне.

Такім чынам, асноўны акцэнт у прапанаваных заданнях для самастойнай работы робіцца на магчымасці студэнта запамінаць, узгадваць, узнаўляць вучэбны матэрыял і выкарыстоўваць яго згодна з узорам. Галоўная мэта – засваенне матэрыялу.

2. *Рэканструктыўны.* Адпаведна гэтаму ўзроўню студэнт прымяняе вядомы спосаб ці спосабы з некаторай мадыфікацыяй у новай сітуацыі. Пры вырашэнні такіх заданняў на аснове вывучанага матэрыялу адбываецца перабудова шляхоў іх выканання, распрацоўваецца новы план рашэння праблемы, складаюцца тэзісы, пішуцца рэфераты.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На наш погляд, эфектыўнымі заданнямі з'яўляюцца: а) падрыхтоўка рэфератаў і дакладаў па тэме (з якімі студэнты выступаюць на семінары); б) адказы на пытанні праблемнага характару; в) распрацоўка тэстаў ці віктарын для кантролю ведаў па тэме, якія на гэтым узроўні павінны ўключаць да 20 пытанняў з варыянтамі адказаў (напрыклад, віктарына "Дабрачыннасць і мецэнацтва"). Для гэтага студэнт павінен азнаёміцца з дадатковай літаратурай, прааналізаваць яе і структураваць; г) будучы спецыяліст павінен знаёміцца з сучаснымі навуковымі даследаваннямі ў галіне сацыяльнай педагогікі, таму яшчэ адным з заданняў гэтага ўзроўню з'яўляецца прагляд артыкулаў у спецыяльнай літаратуры і іх прапрацоўка, складанне на іх аснове блок-схем.

Такім чынам, пры падрыхтоўцы заданняў для самастойнай работы рэканструктыўнага ўзроўню акцэнт робіцца на часткова пошукавыя віды работы студэнта.

3. *Творчы*. На гэтым узроўні ажыццяўляецца творчая самастойная работа, якая патрабуе аналізу праблемнай сітуацыі, атрымання новай інфармацыі, пастаноўкі задачы і распрацоўкі праекта дзейнасці. Студэнт павінен самастойна выбраць спосабы, сродкі і тэхналогіі рашэння праблемы.

У працэсе чытання курса "Сацыяльная педагогіка" мы прапануем студэнтам наступныя творчыя заданні, якія накіраваны на авалоданне практычнымі прафесійнымі навыкамі і ўменнямі: 1) падрыхтоўка прэзентацый па тэме (напрыклад, "Метады сацыяльна-педагагічнага даследавання" ці "Асноўныя кірункі дзейнасці сацыяльнага педагога ва ўстановах СКД"); 2) распрацоўка алгарытмаў дзейнасці сацыяльнага педагога. Студэнту прапануецца самастойна сфармуляваць праблему, выбраць соцыум і прадставіць алгарытм дзеянняў па вырашэнні праблемы (напрыклад, "Праца сацыяльнага педагога з мнагадзетнай сям'ёй"); 3) правядзенне лакальнага педагагічнага даследавання і справаздача аб атрыманых выніках. Студэнт таксама павінен выбраць праблему, потым падабраць неабходны дыягнастычны інструментарый (згодна з характарам праблемы, узростам даследуемых і інш.), правесці аналіз атрыманых даных і сфармуляваць вывады; 4) адным з найбольш эфектыўных метадаў фарміравання прафесійнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры сацыяльнага педагога, на наш погляд, з'яўляецца падрыхтоўка і абарона міні-праектаў. Гэта заданне прадугледжвае ўдзел групы студэнтаў, якая на працягу семестра самастойна распрацоўвае праект па прапанаванай тэме і на апошнім семінары абараняе яго.

Заданні для самастойнай работы творчага ўзроўню – гэта заданні, накіраваныя на развіццё і ўдасканаленне даследчай дзейнасці студэнтаў, яны максімальна набліжаны да іх рэальнай прафесійнай дзейнасці.

Кожны з вызначаных узроўняў уключае шэраг заданняў, якія патрабуюць ад студэнтаў пазнавальнай актыўнасці, самастойнасці і разлічаны на індывідуальную работу. Але, на наш погляд, цэласны падыход да фарміравання і развіцця прафесійнай культуры сацыяльных педагогаў будзе забяспечаны толькі дзякуючы комплекснаму выкарыстанню розных тыпаў заданняў кожным студэнтам. Эфектыўнасць прадстаўленых блокаў заданняў значна павялічваецца пры сістэмным падыходзе да арганізацыі самастойнай работы, калі ўсе яе этапы і ўзроўні будуюцца на падставе агульнапедагагічных прынцыпаў, індывідуальных асаблівасцей і актыўнай дзейнасці саміх студэнтаў.

---

1. *Педагогические* основы самостоятельной работы студентов: пособие для преподавателей и студентов / под общ. ред. О. Л. Жук. – Мн.: РИВШ, 2005.

2. *Мардахаев, Л.В.* Социальная педагогика: учебник / Л.В.Мардахаев. – М.: Гардарики, 2005.

3. *Пидкасистый, И.П.* Самостоятельная деятельность учащегося / И.П. Пидкасистый. – М., 1972.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ